

Жыве Беларусь!

# Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№5(518) 5 студзеня 1993 г. Аўторак.

Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах.

Кошт у розніцу — 4 руб.


## ФАКС

### Вкратце

**8 января начнется официальный визит в Китай Председателя Верховного Совета Республики Беларусь Станислава Шушкевича.**

Ожидается, что официальный визит даст определенный импульс двусторонним отношениям и будет содействовать реализации достигнутых и заключению новых взаимовыгодных соглашений в политической, экономической, культурной и других сферах.

* * *

**Вчера истек срок ультиматума о сдаче оружия, предъявленного правительством Таджикистана силам оппозиции.**

Выступая на прошлой неделе по телевидению, председатель Верховного Совета республики Э.Рахмонов заявил, что более 30 тысяч единиц оружия все еще находятся в руках сторонников оппозиции.

* * *

**Встреча руководителей государств Средней Азии и Казахстана открылась вчера в Ташкенте.**

В ней принимают участие президенты Казахстана, Кыргызстана, Туркменистана и Узбекистана, а также председатель Верховного Совета Таджикистана.

**(ИТАР—ТАСС, Белинформ.)**

### Кто наказал нас рублем?

**С 4 января 1993 г. Национальным банком Беларуси установлены следующие курсы иностранных валют:**

| | Единый курс | Курс инвест. | К доллару США |
|---|---|---|---|
| 1 австрал. доллар | 363.52 | 121.17 | 1.4524 |
| 1 австр. шиллинг | 47.09 | 15.70 | 11.2118 |
| 1 фунт стерлингов | 794.90 | 264.97 | 0.6642 |
| 10 бельг. франков | 161.94 | 53.98 | 32.6044 |
| 1 немецк. марка | 326.74 | 108.91 | 1.6160 |
| 1 голланд. гульден | 290.02 | 96.67 | 1.8205 |
| 1 датская крона | 84.66 | 28.22 | 6.2368 |
| 100 итал. лир | 36.39 | 12.13 | 1,450.8245 |
| 1 канад. доллар | 417.75 | 139.25 | 1.2639 |
| 1 норв. крона | 76.72 | 25.57 | 6.8820 |
| 1 доллар США | 528.00 | 300.0000 | 1.0000 |
| 1 фин. марка | 99.69 | 33.23 | 5.2964 |
| 1 франц. франк | 95.86 | 31.95 | 5.5083 |
| 1 швед. крона | 74.21 | 24.74 | 7.1147 |
| 1 швейц. франк | 360.71 | 120.24 | 1.4638 |
| 10 японск. иен | 42.42 | 14.14 | 124.4746 |
| 1 ЭКЮ | 637.98 | 212.66 | 0.8276 |
| 10 исп. песет | 46.61 | 15.54 | 113.2824 |
| 10 греч. драхм | 25.04 | 8.35 | 210.8340 |
| 1 ирланд. фунт | 861.39 | 287.13 | 0.6130 |
| 1 исланд. крона | 8.32 | 2.77 | 63.4760 |
| 1 кувейт. динар | 1,746.15 | 582.05 | 0.3024 |
| 10 ливан. фунтов | 2.88 | 0.96 | 1,834.0975 |
| 10 португ. эскудо | 36.57 | 12.19 | 144.3747 |
| 1 сингап. доллар | 322.04 | 107.35 | 1.6396 |
| 10 турецк. лир | 0.62 | 0.21 | 8,458.8273 |
| 1 эст. крона | 40.84 | 23.61 | 12.93 |

### Так и Мамай не наследил...

**Полумертвая обезображенная природа предстала пред специалистами-экологами, впервые побывавшими в еще недавно засекреченных окрестностях Дретуньского полигона и на других находившихся в армейском пользовании территориях в Витебской области.**

Из года в год служивые бездумно вырубали и захламляли леса, отравляли реки, спускали воду из богатых рыбой озер, самовольно возводили, где душа пожелает, гаражи и другие строения. Как вернуть к жизни освобождаемые армией земли, хотя бы частично восполнить ущерб, нанесенный природе? Пока ясно одно: для этого потребуются долгие годы и огромные затраты.

**Степан СТОРОЖИЛ.**

### Спорт-экспресс

Еженедельник "Прессбол" учредил собственное звание Человека года. Первым его обладателем стал президент и главный тренер гандбольного клуба СКА (Минск), наставник сборной Беларуси С.П.Миронович.

Звание "Мистер тормоз", учрежденное этим же изданием, за торможение прогрессивных преобразований белорусского спорта досталось председателю Госкомспорта, президенту НОКа Беларуси Владимиру Рыженкову. Но это оценка журналистов, а что думают в Совете Министров?

* * *

Федерация футбола Беларуси получила письмо ФИФА, дающее белорусским арбитрам право выйти на мировую арену.

В штаб-квартире УЕФА в Берне состоялась жеребьевка чемпионата Европы среди юношей 1975—1976 годов рождения и турнира УЕФА для юношей 1977—1978 годов. Соперниками наших футболистов в отборочной группе первого соревнования стали сборные Северной Ирландии и Литвы, второго — сборные Швеции и Эстонии. Игры в отборочных группах пройдут во второй половине 1993 года.

**("Народная газета", БелаПАН.)**

### Вчера услышали...

* Президенты Соединенных Штатов и Франции Буш и Миттеран договорились предоставить участникам мирных переговоров по Югославии больше времени на поиск путей дипломатического урегулирования конфликта.

* Польское профобъединение "Солидарность" вчера приостановило длившуюся три недели забастовку шахтеров.

**(По сообщениям радио "Свобода", Би-би-си.)**

### Станислав Шушкевич приветствует подписание договора о СНВ-2

**"Мы искренне приветствуем подписание российско-американского договора о сокращении стратегических наступательных вооружений", — сказал 4 января Председатель Верховного Совета Республики Беларусь Станислав Шушкевич.**

По его мнению, это не просто очередной шаг в области разоружения, а очень весомый вклад в радикальное сокращение стратегических наступательных вооружений.

Станислав Шушкевич вновь подтвердил безоговорочную верность Беларуси курсу на безъядерность и нейтралитет. Он сказал, что ядерное оружие на территории Беларуси находится под надежным контролем. И хотя он не сомневается в эффективности такого контроля, "мы хотим избавиться от ядерных арсеналов на своей территории как можно быстрее".

По мнению Председателя Верховного Совета Республики Беларусь, необходимо, чтобы число участников процесса разоружения стало шире. Это вовсе не означает, подчеркнул Шушкевич, что речь идет только о Беларуси. И США, и России стоит учитывать, что довольно большое число стран обладает ядерным потенциалом и их следует активнее подключать к процессам разоружения.

**Владимир ГЛОД, Белинформ.**

### Таможня не для изотопа

**Угрозой радиоактивного "импорта" из Литвы продиктованы предложения, направленные Витебским облисполкомом в Совмин Беларуси.**

Обосновывается необходимость договора с соседним государством о мерах предотвращения вредного воздействия Игналинской АЭС на территорию Браславского района, тринадцать тысяч жителей которого находятся в 30-километровой зоне электростанции. Особую тревогу вызывает отсутствие на АЭС системы аварийного оповещения для белорусской стороны.

**Сергей БУТКЕВИЧ.**

### Медицинский прогноз погоды

#### на 5 января 1993 года

**В ближайшие сутки погода в Минске и области будет формироваться под влиянием поля повышенного атмосферного давления.**

Существенных изменений содержания кислорода в воздухе не ожидается. В таких погодных условиях появление выраженных метеопатических реакций у большинства больных маловероятно.

**Антонина КАРОЗА, научный сотрудник БелНИИ кардиологии.**

*Падзея!*

# У нашай старажытнай і вельмі маладой Беларусі такога не было ніколі





❑ Прысягу на вернасць беларускаму народу прымае намеснік міністра абароны генерал-палкоўнік П.Чаус.

❑ Тое, што адбылося 31 снежня, гэта не проста рытуал, гэта сур'ёзны жыццёвы выбар. Гэта бачна нават па тварах афіцэраў КДБ.

❑ А для бацькоў прысяга — проста свята, якое дало ім магчымасць яшчэ раз сустрэцца са сваімі сынамі.

Апошні дзень мінулага года для беларускіх вайскоўцаў выдаўся самы што ні ёсць знамянальны. Роўна шэсць месяцаў былі дадзены афіцэрам і прапаршчыкам на роздум — прымаць альбо не прымаць прысягу на вернасць беларускаму народу. Дарэчы, і апошні, адмоўны, варыянт не цягнуў за сабой трагічнага выніку. Служыць ва Узброеных Сілах Беларусі можна будзе і без прысягі, па спецыяльнаму кантракту.

Шэсць месяцаў развагі далі станоўчыя вынікі. Драматычных падзей не адбылося. Больш таго, гэты дзень, дзень прыняцця прысягі, меў святочнае адценне. Большасць вайскоўцаў (дакладная лічба будзе вядома крыху пазней, бо ўрачыстыя цырымоніі працягваліся яшчэ і ў першыя дні студзеня, што выклікана спецыфікай службы) афіцыйна, добраахвотна і сумленна засведчыла сваю вернасць народу Беларусі. Напрыклад, у войсках сувязі толькі адзін афіцэр не прыняў прысягу. Крыху больш такіх у авіяцыі. Але і тут трэба ставіцца да прынятага афіцэрамі рашэння з разуменнем — яны выязджаюць служыць на радзіму ў Расію.

Дзяржаўны акт прайшоў у вайсковых падраздзяленнях арганізавана і ўрачыста. Ёсць падставы меркаваць, што гэты дзень, у які тысячы і тысячы людзей са зброяй у руках чыталі словы клятвы і ставілі свае подпісы пад прысягай, стане ў далейшым святочным.

***

Словы, вынесеныя ў агульны загаловак, сказаў Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч на прыняцці прысягі генераламі і афіцэрамі цэнтральнага апарату Міністэрства абароны рэспублікі. І дадаў:

— Многія пакаленні беларускіх воінаў прысягалі розным уладарам: хто князю, хто каралю, хто імператару... Але толькі цяпер, толькі сёння воіны прыносяць клятву вернасці менавіта свайму народу. І ў гэтым асаблівы сэнс, асаблівая ўрачыстасць афіцэрскага рытуалу.

Тое, што беларускаму народу прысягнулі ўсе да аднаго генералы і афіцэры цэнтральнага апарату рэспубліканскага Міністэрства абароны, яшчэ раз пацвердзіла, што ідзём мы па правільным шляху і што шлях гэты будзе мірным.

### Пасля прыняцця прысягі ў пагранвойску было шмат песень

Аховай межаў Беларусі кіруе самы малады генерал у краіне народны дэпутат Яўген Бачароў. Задача нялёгкая, бо пагранічнае войска ў стадыі стварэння, а працягласць межаў вырасла з 600 да 2 тысяч кіламетраў. І хоць вакол самастойнай Беларусі ворагаў пакуль што няма, паважаючая сябе дзяржава павінна мець не ўяўную, а сапраўдную граніцу.

Пра вайсковыя і чыста чалавечыя праблемы генерал-маёр Яўген Бачароў перад прыняццем прысягі адкрыта расказваў гасцям, што прыбылі ў штаб пагранічнага войска. Не толькі па абавязку службы тут былі начальнік упраўлення грамадскай бяспекі і абароны Савета Міністраў Генадзь Данілаў і старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Уладзімір Бойка. У першага бацька ў гады Вялікай Айчыннай служыў чэкістам, якіх з пагранічнікамі яднала адно ведамства, і быў вельмі цяжка паранены, у другога два сыны афіцэры. А народны паэт Беларусі Максім Танк, кампазітар Уладзімір Зарыцкі і спявак Віктар Стральчэня, якога ў час канцэрта называлі салаўём Белавежскай пушчы, — а хто, як не пагранічнікі, мае магчымасць слухаць салаўёў у пушчы — прыехалі, як казалі зусім нядаўна, па закліку сэрца.

Максім Танк спачатку падзяліўся ўспамінамі юнацтва аб вымушаным нелегальным пераходзе дзяржаўнай мяжы ў той час, калі ён супрацоўнічаў у камуністычным падполлі Заходняй Беларусі, а потым чытаў свае вершы. Эдуард Зарыцкі і Віктар Стральчэня пад акардэон спявалі, мяркуючы па моцы апладысментаў, спявалі цудоўна.

Нечакана здзівіў прысутных старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда, які таксама выступіў у якасці... спевака. Яго песня ў гонар каханых жанчын аўдыторыі, якая складалася цалкам з сапраўдных мужчын пагранічнікаў, спадабалася.

Генералы, афіцэры і прапаршчыкі пагранічнага войска прысягнулі на вернасць народу Беларусі без ваганняў. І хоць мы ўсё часцей гаворым пра граніцу без замкоў, але спадзёмся, што яна тым не менш будзе ахоўвацца надзейна.

### КДБ — з народам

31 снежня 1992 года быў незвычайным днём не толькі для вайскоўцаў, але і для ўсёй нашай краіны. Усюды, дзе на варце дзяржаўных інтарэсаў служаць людзі ў пагонах, прагучалі словы ваеннай прысягі.

Прагучалі строгія і суровыя словы і ў Камітэце дзяржаўнай бяспекі. Застылі моўчкі ў страі людзі ў зялёнай форме. І толькі па тварах можна было зразумець, што гэта не пустая фармальнасць.



Гэта была клятва на вернасць беларускаму народу. Стаялі ў страі плячом да пляча рускі, беларус, украінец, казах... Але ўсе яны — грамадзяне Беларусі, усе зрабілі свой выбар асэнсавана.

### А для матулі прысяга — проста свята

У арміі святы — справа рэдкая. Але хто іх заўсёды выкарыстоўвае на ўсе сто, дык гэта салдацкія бацькі. Дарагоўля білетаў і адлегласць — не перашкода, каб глянуць на свайго сыночка, яго сяброў. А калі пакажуць камандзіры бацькам, дзе жыве іх сын, дзе служыць і харчуецца, адкажуць на пытанні, то бацькі зусім задаволеныя вяртаюцца дахаты. У святы трываюць армейскія падраздзяленні неадбітае наступленне бацькоў, узброеных ладнымі торбамі ды сумкамі. У бацькоўскім "палоне" на салдата насядаюць з хатнімі прысмакамі і па агульнай згодзе мера не вызначаецца. А назаўтра, магчыма, батальённая санслужба адзначыць зніжэнне боегатоўнасці. Яно і зразумела — гэтулькі з'есці. Але сёння свята, дзень прысягі і сустрэч з бацькамі. І гэта галоўнае.

**Над калектыўным рэпартажам працавалі:**

**Мікалай ГАЛКО,**
**Сяргей ГРЫЦ,**
**Міхась ЖЫЛІНСКІ,**
**Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ.**

## Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

# Аб мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва і рэгуляванню аплаты працы

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь адзначае, што міністэрствамі, ведамствамі, аб'яднаннямі, прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі дапускаюцца сур'ёзныя недахопы ў рэгуляванні аплаты працы. У многіх выпадках прэміі, даплаты і надбаўкі не выкарыстоўваюцца як сродак павышэння прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. У сувязі з зацвярджэннем Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь мінімальнай заработнай платы ў размеры 3000 рублёў у месяц і з улікам кансультацый з аб'яднаннямі прафсаюзаў і наймальнікаў устанавіць з 1 студзеня 1993 г. тарыфную стаўку першага разраду 3600 рублёў у месяц.

2. Міністэрствам, ведамствам, аб'яднанням, прадпрыемствам і арганізацыям прыняць меры па ўдасканаленню заработнай платы, забяспечыўшы яе залежнасць ад вынікаў працы.

Пры вызначэнні размераў аплаты працы работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый па прафесійна-кваліфікацыйных групах кіравацца адзінай тарыфнай сеткай рабочых і служачых народнай гаспадаркі, якая ўстанаўліваецца ўрадам Рэспублікі Беларусь тарыфнай стаўкай першага разраду з улікам павышаючых каэфіцыентаў па тэхналагічных відах работ, вытворчасцях і галінах народнай гаспадаркі, зацверджаных пастановай Дзяржаўнага камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва ад 27 снежня 1991 г. нумар 31.

Рэкамендаваць суб'ектам гаспадарання недзяржаўных форм уласнасці ўстанаўліваць работнікам размеры аплаты працы ў аналагічным парадку.

3. Адобрыць падыходы Дзяржаўнага камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, Міністэрства фінансаў да перагляду адзінай тарыфнай сеткі рабочых і служачых народнай гаспадаркі. Указанаму Камітэту па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў зацвердзіць удакладненую тарыфную сетку і ўвесці яе з 1 студзеня 1993 г.

4. У мэтах выканання пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5 лістапада 1992 г. і ў мэтах упарадкавання аплаты працы работнікаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, фінансуемых за кошт бюджэту, Дзяржаўнаму камітэту па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, Міністэрству фінансаў:

пры пераглядзе адзінай тарыфнай сеткі рабочых і служачых народнай гаспадаркі ўключыць у састаў тарыфных каэфіцыентаў прадугледжаныя пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 1992 г. нумар 587 дадатковыя каэфіцыенты да ставак заработнай платы педагагічных работнікаў, спецыялістаў аховы здароўя, культуры, навукі. Тарыфныя каэфіцыенты для работнікаў іншых сфер вызначаць зыходзячы з неабходнасці захавання існуючых прапорцый;

прадугледзіць пашырэнне правоў выканкамаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў на тарыфікацыю асобных работнікаў па канкрэтных прафесійна-кваліфікацыйных групах у межах устанаўліваемых дыяпазонаў разрадаў;

з удзелам Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў і Галоўнага ўпраўлення пагранічных войск пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь унесці змяненні ў тарыфы па асноўных тыпавых пасадах ваеннаслужачых, асоб радавога і начальніцкага саставу указаных мінітэрстваў і ўпраўлення.

5. Дзяржаўнаму камітэту па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва і Міністэрству фінансаў сумесна з зацікаўленымі ў дзесяцідзённы тэрмін перагледзець тарыфныя каэфіцыенты і разрады па прафесійна-кваліфікацыйных групах работнікаў бюджэтнай сферы.

6. Міністэрству сацыяльнага забеспячэння, Міністэрству абароны, Міністэрству ўнутраных спраў, Камітэту дзяржаўнай бяспекі і Галоўнаму ўпраўленню пагранічных войск пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь з 1 студзеня 1993 г. зыходзячы з новага размеру мінімальнай заработнай платы правесці пераразлік пенсій, а Дзяржаўнаму камітэту па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва перагледзець размеры стыпендый і дапамог.

7. Міністэрству фінансаў, выканкамам мясцовых Саветаў народных дэпутатаў прадугледзець у адпаведных бюджэтах на 1993 год сродкі для павышэння заработнай платы работнікаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія ўтрымліваюцца за кошт бюджэтных асігнаванняў.

8. Устанавіць, што назначаныя да 1 студзеня 1993 г. дапамогі па беспрацоўю і стыпендыі грамадзянам, якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, павышаюць кваліфікацыю па накіраванню дзяржаўнай службы занятасці, з 1 студзеня 1993 г. павялічваюцца у 1,5 раза.

9. Дзяржкамстату забяспечыць разлік індэкса цэн, які характарызуе змяненне кошту "спажывецкай карзіны" ў адносінах да базісных цэн студзеня 1993 года і яго публікацыю ў рэспубліканскім друку.

10. Прызнаць страціўшымі сілу пункт 4 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 1991 г., нумар 482 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1991 г., нумар 36, арт. 443; 1992 г., нумар 7, арт. 103), пункт 6 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 студзеня 1992 г., нумар 46 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., нумар 3, арт. 43), абзац першы пункта 1 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 1992 г., нумар 361 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., нумар 17, арт. 317; 1992 г., нумар 18, арт. 330), пункты 1.1 і 10 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1992 г. нумар 658 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., нумар 31, арт. 560).

**Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.КЕБІЧ.**

**Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.КАЎКО.**

31 снежня 1992 г.

г.Мінск.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

*Таленты Айчыны*

# Важкі ўклад у мастацкую скарбніцу Беларусі

Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прысуджаны Дзяржаўныя прэміі 1992 года ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Сёлетняе прысуджэнне гэтых самых аўтарытэтных у Беларусі прэмій мае сваю адметнасць: яна ў тым, што ўпершыню за выдатныя дасягненні ў галіне мастацкай творчасці прысуджаны прэміі незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Гэта па-першае; па-другое, Камітэт па Дзяржаўных прэміях працаваў у новым складзе і паводле абноўленых палажэнняў.

Ёсць усе падставы лічыць, што адзначаныя гэты раз прэміяй творы праўдзіва адлюстроўваюць высокі ўзровень творчага духу, таленавітасці і мастакоўскай самапатрабавальнасці іх аўтараў.

У галіне паэзіі Дзяржаўнай прэміяй імя Янкі Купалы адзначаны кніга Сяргея Законнікава "Заклінанне" і кніга Алеся Звонака "Светлацені". Сяргей Законнікаў сёння ў самым росквіце творчых сіл. Аматарам паэзіі ён даўно вядомы сваёй глыбокапатрыятычнай лірыкай, вельмі чуйнай да пульсу часу. У кнізе "Заклінанне" асабліва вымоўна "прамаўляе" агалены нерв публіцыстычнасці, у ёй шмат болю і горычы, пяшчоты, чалавечага даверу, дабрыні, — той, я сказаў бы, беларускасці характару, што робіць яе лірычнага героя асабліва прывабным. Дадамо да гэтага свежасць і выразнасць паэтычнай мовы, багацце яе інтанацый, майстэрскае абыходжанне са словам. Старэйшына беларускай паэзіі Алесь Звонак працуе ў літаратуры амаль

семдзесят гадоў. Праўда, дваццаць з іх былі жорстка вырваны з жыцця паэта: яму давялося ні за што, без віны зведаць жудасную сібірскую катаргу і ссылку. У яго новай кнізе нямала вершаў і пра гэта. Дасканалы майстар класічнай формы, паэт гаворыць пра перажытае і набалелае з пачуццём высокай чалавечай годнасці, без надрыву і экзальтацыі, па-філасофску спакойна і мудра, з верай у добры, светлы пачатак людскога жыцця на зямлі.

Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа сталі Сяргей Грахоўскі, Алесь Жук і Васіль Сёмуха. Сяргея Грахоўскага чытачы ведаюць і як шчырага, пранікнёнага лірыка, і як аўтара шматлікіх кніг цікавай, так бы мовіць, непрыдуманай прозы. Як і А.Звонак, С.Грахоўскі — былы вязень сталінскіх канцлагераў. Яго кніга "Споведзь" — праўдзівы расказ пра жахі ГУЛАГа, перасыпаны балючымі, горкімі радкамі вершаў. Гэта новы важкі крок паэта і пісьменніка ў шматгадовай напружанай працы над адной з самых трагічных тэм беларускай літаратуры. Кніга Алеся Жука "Праклятая любоў" — яскравае сведчанне высокай творчай сталасці вядомага празаіка, майстра псіхалагічна-праўдзівага, рэалістычнага — без даважкаў публіцыстыкі і лірычнай рыторыкі — пісьма, добрага знаўцы народнага жыцця і побыту, чалавечых лёсаў і характараў, што раскрываюцца не толькі ў дзеяннях і ўчынках, але і ў вобразнай і сакавітай "слуцкай" мове. Прызнаны майстар мастацкага перакладу Васіль Сёмуха адзначаны прэміяй за адну з найбольш пераканаўчых удач свайго нялёгкага рамяства — за пераклад знакамітага філасофскага рамана Томаса Мана "Доктар Фаўстус". Да гэтага ён падарыў беларускім чытачам "Фауста" Гётэ і творы многіх еўрапейскіх паэтаў. У новай працы Сёмуха засведчыў не толькі асабістыя творчыя магчымасці, але і магчымасці нашай мовы, што вельмі важна для развіцця мастацкага перакладу ў Беларусі.

Лаўрэатам прэміі імя Кастуся Каліноўскага стаў вядомы гісторык і публіцыст Мікола Ермаловіч — за кнігу "Старажытная Беларусь. Полацкі і Навагарадскі перыяды". Імя гэтага даследчыка гісторыі Беларусі — не ахопленага ніякім творчым калектывам адзіночкі — сёння адно з самых аўтарытэтных сярод навукоўцаў, з ім звязаны паварот нашай гістарычнай навукі да аб'ектыўнага асвятлення лёсу беларускага народа. Напісаная з добрым палемічным запалам, жывой эмацыянальнай мовай, кніга М. Ермаловіча прынята чытачамі з удзячнасцю і радасцю як доўгачаканы падарунак, якім яна для іх і з'яўляецца.

З вылучаных на Дзяржаўную прэмію твораў для дзяцей і юнацтва гонар дастаўся кнізе пісьменніка Яраслава Пархуты "Зямля бацькоў нашых" — з падзагалоўкам "Падарожжа па родным краі". Гэта цікавая, змястоўная і вельмі патрэбная для патрыятычнага выхавання дзяцей кніга сапраўды ёсць вынік незлічоных і нястомных вандровак аўтара па Беларусі. Зайздросная энергія падарожніка, спалучыўшыся з назіральным "вокам" і тонкім адчуваннем хараства прыроды, чалавека і роднага слова, дала шчаслівы плён.

У галіне журналістыкі Дзяржаўная прэмія прысуджана Аляксандру Уліцёнку за кнігу публіцыстыкі "Іншадумцы" ("Мыслящие иначе"). Гэта зборнік яго размоў з добра вядомымі, малавядомымі і амаль невядомымі людзьмі па розных актуальных пытаннях сучаснага грамадска-палітычнага жыцця. У адлюстраванні разнасці поглядаў і думак суразмоўнікаў журналіста, сярод якіх пісьменнікі, навукоўцы, грамадскія дзеячы, палітыкі, — несумненная вартасць кнігі, прафесіянальна задуманай і арганізаванай.

Кампазітару Галіне Гарэлавай Дзяржаўная прэмія прысуджана за кантату "У год сусветнага пажару", напісаную на вершы рускіх і еўрапейскіх паэтаў. Твор гэты — адметная з'ява ў сучаснай беларускай вакальна-інструментальнай музыцы. Спалучэнне трагедыйнага гучання са светлым лірызмам, свежасць музычнай мовы, высокі прафесіяналізм надоўга, трэба думаць, забяспечаць таленавітаму твору поспех.

У галіне тэатральнага мастацтва Дзяржаўнай прэміяй адзначаны спектакль "Тутэйшыя" ў пастаноўцы БДАТ імя Янкі Купалы. Лаўрэатамі сталі рэжысёр-пастаноўшчык Мікалай Пінігін, кампазітар Уладзімір Кур'ян, выканаўцы галоўных роляў артысты Уладзімір Кін-Камінскі і Віктар Манаеў. Сучаснае, арыгінальнае сцэнічнае прачытанне знакамітай камедыі Янкі Купалы — несумненны поспех таленавітага творчага калектыву, пацвярджэнне вернасці лепшым традыцыям нацыянальнага акадэмічнага тэатра і падмацаванне надзей, якія на яго ўскладаюць аматары беларускага тэатральнага мастацтва.

Творчасць мастака Эдуарда Агуновіча даўно заваявала прызнанне ў шырокіх колах грамадскасці, і невыпадкова, што яго працы апошніх гадоў — архітэктурна-мастацкае вырашэнне экспазіцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску і Музея партызанскай славы ва Ушачах адзначаны Дзяржаўнай прэміяй. Таленавітая і, не будзе перабольшаннем сказаць, самаахвярная работа мастака заслугоўвае гэтай высокай ацэнкі. Прэміяй у галіне мастацтва адзначаны таксама творы Міколы Селешчука — серыя графічных артыкулаў "Святы", цыкл маляўнічых палотнаў "Мая Беларусь", ілюстрацыі да кніг "Сымон-музыка" Якуба Коласа і "Сказки белорусских писателей". Творчасць гэтага жывапісца і графіка, вядомая не толькі ў Беларусі, а і далёка ў свеце, вылучаецца яркай самабытнасцю, своеасаблівым — на мяжы фантастычна-казачнага і рэалістычнага — бачаннем свету, смеласцю творчай выдумкі, тонкім адчуваннем і непаверхоўным выяўленнем вернасці нацыянальным вытокам.

Адзначаныя Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь творы — важкі ўклад у скарбніцу беларускай літаратуры і мастацтва. Прыемна ўсведамляць, што і ў далёка не лепшых сацыяльна-эканамічных і палітычных умовах музы не маўчаць, самааддана працуюць дзеля ўзвелічэння і славы Бацькаўшчыны.

Павіншуем жа новых лаўрэатаў з высокай ацэнкай іх творчых дасягненняў і пажадаем ім натхнення і багатага плёну ў далейшай працы.

**Ніл ГІЛЕВІЧ,**
**старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях РБ у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.**

*Не ўсё так дрэнна*

## Акрамя вядомага піва, лідчане ўмеюць рабіць і дыхтоўную мэблю

**Прадпрыемстваў, якія працуюць з нарошчваннем аб'ёмаў вытворчасці, у Лідзе з паўдзесятка, не болей. Сярод іх — вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне.**

Але дырэктара Віктара Бурага адольвае не столькі радасць ад поспехаў на фоне агульнага ўпадку, колькі заклапочанасць пра заўтрашні дзень.

— Нашы людзі працуюць цудоўна, прадукцыю збываем імгненна, заўсёды з грашыма, а вось расплаціцца з пастаўшчыкамі не можам. Шмат камплектуючых дэталей мы бяром у так званым бліжнім замежжы, але перавесці туды нашы грошы банкі адмаўляюцца. Усё гэта прымушае неяк выкручвацца, камбінаваць...

А прадукцыя прадпрыемства, корпусная мэбля, сапраўды прыгожая і дыхтоўная. Секцыі "Лада", прыхожая "Наташа", дэкаратыўныя паліцы зробяць утульным любое памяшканне. Вось толькі цэны не падуладны лідскім вытворцам і растуць шпарчэй, чым мяняюцца месяцы на календары.

❑ **Адзін з лепшых работнікаў аб'яднання — брыгадзір сталяроў Юрый ЧЭРНІКАЎ.**

❑ **На ўчастку ўпакоўкі прыхожай.**

Сяргей ГРЫЦ.
Фота аўтара.

*Ведай нашых!*

## Пах чабаровы...

Мясаперапрацоўчая, рыбная, кандытарская галіны Беларусі, здаецца, хутка пазбавяцца ад назойлівага галаўнога болю з прычыны забеспячэння вытворчасці вострымі прыправамі.

Пра свае вялікія магчымасці і яшчэ большыя планы на будучыню аб'явіла пакуль што маладая, але шматабяцаючая фірма "Экафіт". Сфера яе дзейнасці — вырошчванне, закупкі за межамі Беларусі, перапрацоўка, экспарт і імпарт раслінай сыравіны, выраб з яго фітапрадуктаў. Працаваць у такой вузкаспецыяльнай галіне ды яшчэ на экалагічна неспрыяльнай тэрыторыі няпроста. Але за справу ўзяліся спецыялісты — нядаўнія супрацоўнікі інстытутаў батанікі, мікрабіялогіі, хіміі, біяхіміі АН Беларусі. Гэта яны парэкамендавалі новыя вострыя прыправы і прадоўжылі справу па некалькіх напрамках. Напрыклад, пашырылі геаграфію закупак. Крым, Стаўраполле, Краснадарскі край — гэта толькі буйнейшыя пастаўшчыкі. А што датычыць перцу чорнага і духмянага, кардамону, імбіру, ванілі, як раз таго, у чым асабліва маюць патрэбу мясаперапрацоўшчыкі і кандытары, дык яны дастаўляюцца з-за мораў-акіянаў, з самых што ні ёсць тропікаў. Працуюць толькі па сертыфікатах і вялікімі партыямі.

Мясакамбінаты і заводы Мінска, Віцебска, Полацка, Слуцка, Барысава, Пухавічаў ужо атрымалі так патрэбную ім духмяную прадукцыю тонамі і аценілі дзелавыя якасці спецыялістаў фірмы.

У поле зроку "Экафіту" ўваходзяць і праблемы медыцыны. Міністэрствамі аховы здароўя Беларусі і Расіі зацверджаны распрацаваныя спецыялістамі фірмы фітапрэпараты, якія рэкамендаваны як вітамінныя чайныя напіткі і як прафілактычныя зборы для ваннаў. Такім чынам, у медыкаў з'яўляецца магчымасць пашырыць кола аздараўленчых гідратэрапеўтычных працэдур. І гэта асабліва важна ў перыяд суцэльнага лекавага дэфіцыту. Бо самыя карысныя для чалавека лекі знаходзяцца вакол нас — гэта расліны, бескарыслівыя сябры чалавека...

Фірма "Экафіт" прымае заяўкі...

**Наталля ПОПЕЛЬ.**

*Дапамажыце!*

## За што я ўсё жыццё змагаўся

Мне ўжо 88 гадоў. Жыву адзін на хутары. Партызаніў, ваяваў да вызвалення Берліна. Нават ордэн маю.

Але пасля вайны адабралі зямлю і ўсё, што было ў гаспадарцы, прымусілі аддаць у калгас. Сродкаў, каб перасяліцца ў вёску, за свой век так і не набыў. Таму і жыву ў сваёй хаціне на хутары без святла да сённяшняга дня.

Праўда, у 1987 годзе даведаўся, што мне абавязаны правесці электрычнасць. Але ў Карэліцкім РЭС адказалі, што за гэта калгас павінен заплаціць пэўную суму. Старшыня калгаса, зразумела, адмовіў.

Цяпер жа правядзенне лініі электраперадачы да маёй хаты каштуе прыкладна 40 000 рублёў. Дзе ж мне іх узяць?

А жыць жа трэба. Газы нідзе купіць не магу — не ходзяць аўтобусы, а дайсці да вёскі не стае сілы. Лучыны і той назапасіць не магу. Вось і думаю, за што я ўсё жыццё змагаўся?

**Пётр АБРАМОВІЧ.**
**вёска Беражнае Карэліцкага раёна.**

*А што на Міншчыне?*

## У Салігорску разводзяцца шахцёры...

**"Беларускалій", здаецца, у сённяшніх структурах загадаў доўга жыць.**

Магчыма, назва і захаваецца, але рудаўпраўленні стануць самастойнымі. Гэта прывядзе да значнага скарачэння апарату. Сапраўды, нешта накшталт малога СНД. Толькі ці будзе ад гэтага карысць?

## ... А ў вобласці дырэктары аб'ядноўваюцца

**Яшчэ адзін саюз створаны на Міншчыне. Аб'ядналіся кіраўнікі прадпрыемстваў.**

Матывіроўка — ніхто нас не абароніць, калі не абаронім самі сябе.

Паглядзіш вакол — суцэльная кругавая абарона. Аграпрам абараняецца, старшыні калгасаў, кактусаводы, сабакаводы. Ад каго толькі?

**Іван КРАЎЧУК.**

*Есть предложение*

## Прописку отменить! Отчество восстановить!

Внимательно прочитал интервью обозревателя Н.Дебело с начальником паспортного отдела МВД Беларуси А.Барташевичем "Неужели обойдемся без пятой графы? Конечно!" И вот хочу высказать свои предложения по поводу нового белорусского паспорта.

Итак, в этот паспорт обязательно следует внести (или в графе "Особые отметки", или рядом с фотографией) также и группу крови владельца. Этот штамп может сослужить хорошую службу при различных непредвиденных обстоятельствах. Что касается параграфа "Прописка", то его нужно отменить. Это — чистейший Анахронизм (с большой буквы). И вот почему. В связи с дальнейшей демократизацией нашего общества и принятием закона о приватизации у многих наших граждан появится не один дом или квартира, а несколько, и даже в разных частях республики. Как тогда прикажете быть с пропиской? Ее нужно упразднить, и как можно скорее. Вместо этого в паспорте нужно оставить две строки: "Место жительства", в которых будет записан один из постоянных адресов проживания владельца.

Теперь о внешнем виде паспорта. Почему обложка именно темно-синего цвета, а не зеленого, желтого или бело-красно-белого (!)? Из каких соображений исходили художники? Зеленый цвет даже более традиционен для Беларуси, чем темно-синий. Вообще паспорт — это самый важный документ, поэтому обложка его должна быть яркой, хорошо заметной издалека, различимой и в то же время немаркой. Из всех цветов наиболее различимы на далеком расстоянии и при искусственном освещении оранжевый и желтый. Чем руководствовались, когда проектировали обложку именно темно-синего цвета? И почему размеры будущего паспорта очень подходят под размер "молоткастого и серпастого"? Что это — дань уходящему? Размер паспорта прежде всего должен быть удобным для помещения его в карманах одежды, бумажниках.

Что касается предложения исключить строку с записью отчества, то делать этого не стоит. Менять укоренившиеся уже традиции — лишний раз играть на чувствах народа.

Стоимость паспорта должна быть доступной для всех наших граждан, всех слоев населения, например — 10 процентов от минимальной заработной платы в республике.

**Юрий КОЗЛОВ.**
**Поселок Борковичи Витебской области.**

*Канфліктная сітуацыя*

# У чыіх руках цэнзарская дубінка?

**Сяргей НАВУМЧЫК, каардынатар парламенцкай апазіцыі Беларускага народнага фронту**

**Апошнім часам у перыядычных выданнях з'явіліся інтэрвію міністра інфармацыі А.Бутэвіча і яго намесніка І.Карэнды, у якіх паважаныя спадары папракаюць прадстаўнікоў апазіцыі за тое, што нібыта яны ўвялі насельніцтва ў зман, заявіўшы, што кіраўніцтва міністэрства парушыла дамоўленасць аб прадастаўленні эфірнага часу апазіцыі.**

**Патрэбнасць аднавіць ісціну прымушае звярнуцца да храналогіі падзей.**

"Ніякай папярэдняй дамоўленасці аб выдзяленні пастаяннага эфірнага часу для апазіцыі БНФ не было", — заяўляў ў "Звяздзе" за 7 кастрычніка мінулага года Анатоль Іванавіч і меў у гэтым абсалютную рацыю. Ведаючы, што ні пад якім соусам шаноўны міністр эфір Народному фронту не прадаставіць і ўсялякія размовы пра гэта — марнаванне часу, мы патрабавалі эфір для дэпутацкай апазіцыі БНФ.

Бо, па-першае, Закон аб статусе народнага дэпутата Беларусі такую магчымасць нам гарантуе. Па-другое, апазіцыя прадстаўлена не толькі сябрамі БНФ, але і членамі іншых дэмакратычных партый.

Карыстаючыся законам, 13 жніўня г.г. мы і звярнуліся да міністра інфармацыі А. Бутэвіча з патрабаваннем прадаставіць дзве гадзіны тэлевізійнага эфіру і адну — радыёэфіру штотыдзень. Меркавалася, што ў перадачах возьмуць удзел і сябры дэмакратычных партый, якія не з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнага Савета, і дэпутаты мясцовых Саветаў (у правінцыі, як вядома, прыхільнікам дэмакратычных прынцыпаў значна цяжэй прабіцца ў прэсу).

26 жніўня мы сустрэліся з намеснікам міністра інфармацыі Іванам Карэндай і намеснікамі старшыні Беларускай тэлерадыёкампаніі (БТРК) Баляславам Сушкевічам і Паўлам Шаўчуком (Бутэвіч і Сталяроў былі ў адпачынку).

Мы меркавалі, што падобныя перамовы трэба весці, зыходзячы з прынцыпаў узаемнага даверу, і не бачылі патрэбы ўключаць дыктафон, але захаваўся пратакол гэтай, як нам тады падалося, канструктыўнай гутаркі.

**Карэнда.** Згодны, што сітуацыя ў сродках масавай інфармацыі не адпавядае рэаліям, якія ёсць у нашай суверэннай дзяржаве. Усе палітычныя сілы павінны мець доступ да эфіру, і голас дэмакратычнай апазіцыі павінен гучаць поўна.

**Шаўчук.** Хацелася б сустрэцца з БНФ, з апазіцыяй. Ёсць пра што пагутарыць, не шкадуючы часу.

**Навумчык.** Мы ў любы момант гатовыя да такога канструктыўнага дыялога.

**Пазьняк.** Дык якія магчымасці вы бачыце для двухгадзіннага эфіру апазіцыі?

**Шаўчук.** Ад вас павінен быць чалавек, які б трымаў сувязь са мной. За два тыдні да кожнай перадачы вы павінны прадставіць сцэнарны план — такі парадак. І не трэба цягнуць — я б хацеў тэрмінова сустрэцца зноў і дамовіцца пра тэхнічныя дэталі.

**Сушкевіч.** Калі вы пытаецеся пра найбольш зручны час на радыё, то гэта — ранішні і абедзенны. Але я таксама прасіў бы вызначыць адказных з вашага боку, мы ж пашукаем радыёжурналістаў.

**Навумчык.** Прашу мець на ўвазе, што ад ганарараў мы адмаўляемся.

**Пазьняк.** У бліжэйшы час мы распрацуем тэкст дамовы, зыходзячы з вашых пажаданняў.

Такім чынам, папярэдняя дамоўленасць аб стабільным эфірным часе для парламенцкай апазіцыі была дасягнута. Пра гэта тады ж, у жніўні, паведамілі газеты "Звязда", "Добры вечар". Ніякіх абвяржэнняў з боку Мінінфарма і БТРК не было. Больш таго — неўзабаве адбылася яшчэ адна сустрэча з П. Шаўчуком, і па яго просьбе склалі тэкст дамовы, у якім дакладна зафіксавалі абавязкі як аднаго, так і другога бакоў. Былі вызначаны і адказныя з боку апазіцыі — дэпутаты І. Гермянчук, Л. Дзейка і аўтар гэтых радкоў.

І вось — чарговая сустрэча, на гэты раз з вярнуўшыміся пасля летніх вакацый А. Бутэвічам і нядаўна зацверджаным на пасадзе старшыні БТРК А. Сталяровым.

**Бутэвіч.** Сэнс дамовы палітычны, бо сёння дэ-факта ніякіх перашкод для апазіцыі не існуе. Вы ствараеце прэцэдэнт, а гэтага рабіць нельга... Я згодны, трэба даць магчымасць выступаць, але можа прагладвацца палітызацыя Вярхоўнага Савета... Мая пазіцыя: такія дамовы павінен падпісваць спецыяліст — Сталяроў.

**Сталяроў.** Падтрымліваю Бутэвіча. Дамова нас не задавальняе. Сацыяльныя даследаванні паказалі: ні адной палітычнай праграмы ў фарватэры няма...

**Навумчык.** А ці шмат людзей глядзяць вашу "Тэлебіржу", якая прадае "Мерседэсы" за мільёны?

**Сталяроў.** Дзве гадзіны на тыдзень — нерэальныя ўмовы.

**Пазьняк.** Давайце размаўляць канкрэтна.

**Бутэвіч.** Тады апазіцыя павінна ствараць сваё тэлебачанне.

**Гермянчук.** Навошта? Вы павінны адлюстроўваць палітычны працэс.

**Пазьняк.** Мы маем гарантаванае законам права выхаду ў эфір. Вы адмаўляеце нашу дамову?

**Бутэвіч.** Так.

**Пазьняк.** Увогуле адмаўляеце?

**Бутэвіч.** Не. Апазіцыя мела, мае і будзе мець права ўдзельнічаць у любых перадачах, інфармацыйных і цыклавых.

**Пазьняк.** А калі мы замовім 30, 40, 50 хвілін эфіру?

**Сталяроў.** Не.

**Навумчык.** Значыць, вы адмаўляеце нам нават у тым, што мы, хоць і зрэдку, мелі раней?

**Сталяроў.** Так.

**Пазьняк.** Далейшая гаворка не мае сэнсу. Усяго найлепшага.

Такім чынам, вынік перамоў — нулявы.

Шаноўныя спадары ў сваіх інтэрв'ю гавораць пра нейкія ультыматумы з нашага боку. Але казаць пра ціск можна было б тады, калі б сябра БНФ Навумчык, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча сакратара парламенцкай Камісіі па сродках інфармацыі (я займаў гэтую пасаду да апошняга часу), выклікаў бы да сябе міністра, намеснікаў і загадаў бы прадаставіць ягонаму палітычнаму руху эфірны час. Мяркую, што былы намеснік загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ А. Бутэвіч і былы загадчык сектара ЦК КПБ А. Сталяроў (абодва, дарэчы, члены ЦК апошняга, "малафееўскага" склікання) пра падобныя метады "партыйнага кіраўніцтва прэсай" ведаюць. Прадстаўнікі ж Народнага фронту ніколі імі не карысталіся. Але, выбачайце, нам надакучыла за больш як два гады губляць час на шматдзённыя, безвыніковыя перамовы з тэле- радыёначальнікамі. І не трэба шаноўнаму міністру ўводзіць у зман грамадства, заяўляючы, што ў апазіцыі няма ніякіх перашкод для выхаду ў эфір. Вось прыклад — 3 лістапада, калі адказны супрацоўнік дзяржаўнага радыё на маю просьбу даць магчымасць зачытаць у "Радыёфакце" Заяву апазіцыі наконт рашэння ВС па рэферэндуму (яна, дарэчы, была падпісана 32 дэпутатамі) не проста адмовіў, але і дадаў пры гэтым: "А навошта ваду баламуціць?" Дзякуючы смеласці супрацоўніц маладзёжнай рэдакцыі ў эфір мы ўсё ж выйшлі. А пазней журналісты БТРК растлумачылі, што зверху паступіў загад: пра рэферэндум у эфіры — ні слова.

Метады, завучаныя шаноўнымі спадарамі Бутэвічам і Сталяровым у герметычных кабінетах камуністычнага ЦК і перанесеныя ў інфармацыйную палітыку незалежнай дзяржавы, — не на карысць грамадству. Грамадства зацікаўлена ў цывілізаваным і паслядоўным развіцці палітычных працэсаў, калі кожны слой насельніцтва можа як шырэй выказваць свае інтарэсы праз партыі. І гэта — найважнейшая ўмова палітычнай, эканамічнай ды якой хочаце стабільнасці, гарантыя ад панавання люмпенізаваных, ахлакратычных сіл. Таму ў шмат якіх краінах з багатым вопытам дэмакратыі закон прадугледжвае фінансаванне партый, стварэнне для іх спрыяльных умоў, гарантаваную магчымасць прапагандаваць свае праграмы.

А ў нас спрабуюць спагнаць плату за эфір з партый і палітычных рухаў, якім дзяржава не дала ні капейкі. Затое не шкадуецца ні сродкаў, ні эфірнага часу на спаборніцтвы прэс-службаў кіраўніка парламента і кіраўніка ўрада за імідж сваіх патронаў. Старанна аналізуецца, якім кеглем набрана ў тыпаграфіі прозвішча шэфа, у якім месцы газетнай паласы змешчана справаздача пра чарговую шоу-сустрэчу з народам. А потым цынічна заяўляецца, што, бач ты, партыі ў нас нешта не пашыраюцца, не сталеюць, нейкія яны кволыя і насельніцтву амаль не вядомыя, затое рэйтынг асобна ўзятай асобы значна большы, чым папулярнасць усіх партый і рухаў разам узятых. І як высновa — прапанова правесці новыя выбары парламента па партыйных спісах не мае рэальных падстаў...

Зрэшты, ёсць у нас партыя, якая бесперашкодна і ў любым памеры выкарыстоўвае аплачаны падаткаплацельшчыкамі эфір. Гэта — партыя ўлады, партыя пракамуністычнай наменклатуры, якая, зрабіўшы ведамасную ракіроўку, не збіраецца рызыкаваць сваёй кіруючай роляй. Ды й сапраўды — навошта даваць апазіцыі магчымасць выказаць сваю эканамічную канцэпцыю, калі нават урад не мае дакладнай праграмы? Якая карысць у тым, што будуць нарэшце названы камерцыйна-карупцыйныя "проделки" дзяржаўных магнатаў?

Сапраўды, навошта ўсё гэта выпускаць на свет божы, калі ёсць магчымасць схаваць?

Так што паводзіны кіраўнікоў дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі цалкам адпавядаюць пастулатам партыйнай дысцыпліны, і яны могуць смела глядзець у вочы сваіх былых таварышаў па партыі.

Вось толькі не трэба тады шаноўным спадарам на ўрачыстых пасяджэннях і дыпламатычных раўтах заяўляць пра імкненне ісці ў Еўропу, у цывілізаваны свет.

**АД РЭДАКЦЫІ.**

**Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, нам стала вядома, што намеснік міністра інфармацыі І.Карэнда па-іншаму праінтэрпрэтаваў ход гутаркі з прадстаўнікамі парламенцкай апазіцыі, што, дарэчы, зрабіла і кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі. У рэдакцыі "Народнай газеты" няма магчымасці высветліць, з якога боку больш аб'ектыўнасці, а таму пакідаем усё гэта на сумленні як аўтара артыкула, так і яго апанентаў.**

**Галоўнае — праблема ёсць і яе трэба вырашаць. Як? Над гэтым неабходна больш глыбока падумаць усім зацікаўленым бакам. А можа, чытачы параяць?**



# МИР НА ДОСУГЕ

Народная газета

## Дорогие друзья!



Для вас, кто с нами уже давно и кто только в этом году решил встречаться с "Народной газетой", мы открываем новую рубрику "Мир на досуге". Ведь ни для кого не секрет, что каждому из нас помимо нелегких повседневных забот, помимо политических и экономических страстей для нормальной жизни необходим и отдых. И чем труднее и сложнее наша жизнь, тем больше должно быть у нас возможностей для этого. Но, чтобы отдыхать, нужны деньги, время и... информация о том, где и как разумнее всего провести свой досуг, отпуск и просто выходной день. Куда и как, по какой цене и когда лучше всего поехать путешествовать, отдыхать, лечиться, наконец, — на все эти вопросы вы сможете найти ответы в нашей рубрике. Более того, мы постараемся дать вам возможность из предлагаемых маршрутов, круизов, домов отдыха выбирать те, которые вам наиболее подходят. И, самое главное, будем рассказывать о проблемах, которые переживает туризм профессиональный и так называемый самодеятельный или спортивный, о перспективах его развития.

"Туризм и отдых — для каждого!" — таким будет девиз нашей рубрики. Туристские фоторепортажи, личные впечатления участников путешествий, реклама новых маршрутов, встречи с руководителями турпредприятий всегда найдут место на наших страницах. Будем рады вашим письмам и постараемся ответить на все вопросы.

## Аляксандр ПАСЮКЕВІЧ:

# "Турызм у Польшчы — адзін з важнейшых прыярытэтаў у развіцці нацыянальнай эканомікі"

**На Беларусі турызм — як эканамічная галіна — пакуль што знаходзіцца ў стадыі зараджэння. А што адбываецца ў нашых суседзяў? Мы папрасілі пастаяннага прадстаўніка ВАО "Інтурыст" у Рэспубліцы Польшча мінчаніна Аляксандра Пасюкевіча расказаць аб праблемах і магчымасцях турыстычных прадпрыемстваў Польшчы.**

— Хачу сказаць, што наша ўяўленне аб Польшчы як аб краіне, якая перажывае перыяд эканамічнай нестабільнасці, што зацягнулася, сёння павінна застацца ў мінулым. Мы часта забываем, што пасля Германіі, Францыі, Італіі Польшча з яе насельніцтвам у 38 мільёнаў чалавек з'яўляецца буйнейшай дзяржавай Еўропы. Заходнія ж яе рэгіёны — Познань і іншыя гарады — гэта цэнтры дынамічна развітога грамадства з дастаткова высокім узроўнем спажывання і развітым турысцкім рынкам, які падтрымліваецца пратэкцыянісцкай палітыкай урада.

Палякі паставілі развіццё турызму дзяржаўнай мэтай. Гэта адзін з важнейшых прыярытэтаў у станаўленні нацыянальнай эканомікі. У дакументах яе перспектыўнага развіцця так і запісана: нішто не дае такой хуткай аддачы сродкаў, як турызм і сельская гаспадарка. Не выпадкова 4% насельніцтва і 9% прадпрыемстваў Польшчы занята ў турысцкай сферы, а гэта ж каштоўныя рабочыя месцы, без якіх немагчыма сацыяльная стабільнасць у грамадстве. Паглядзіце, якая дынаміка росту турысцкага бізнесу ў Польшчы: у 1990 годзе краіна прыняла 17 млн. турыстаў, у гэтым прыме не менш як 50. Нам трэба вучыцца гэтай стратэгіі. Зараз палякі адкрылі свае культурныя прадстаўніцтвы ў ЗША, Францыі, Швецыі. Там ідзе вялікая работа па стварэнню прыцягальнага вобраза краіны і павелічэнню попыту на польскія падарожжы.

Адным словам, яны працуюць на будучае. Зараз асноўны паток гасцей ідзе з Германіі і Чэха-Славакіі, 7 мільёнаў — з СНД. Прычым у гэтай статыстыцы самае прыемнае, што толькі 17% гэтай колькасці скарысталі паслугі турбюро. У краіне бязвізавы рэжым уезду іншаземцаў. Яны могуць спыняцца, дзе захочуць — у прыватных пансіянатах, на кватэрах і г.д. Буйным турысцкім прадпрыемствам гэта нявыгадна, дзяржава таксама атрымлівае мізэр, але багацеюць грамадзяне Польшчы і валюта застаецца ў краіне. Урад гэта разумее. Буйныя тураператары і ўладальнікі гасцініц вымушаны ісці на скідкі, змагацца за кліента па-сапраўднаму.

2,5 мільярда долараў пакінулі ў мінулым годзе ў Польшчы замежныя турысты. У сярэднім кожны траціў у дзень не менш як сотню. "Савецкія" — толькі 7—8 долараў. Але затое вывезлі з краіны 700 мільёнаў долараў. Што ж, нашы суседзі разумеюць, што гэта не самая дарагая цана за сацыяльную стабільнасць, якую ўскосна забяспечваюць і вулічныя гандляры — турысты з СНД, падтрымліваючы найбольш бедных палякаў.

